**УДК 2-9(476)(XVI–XVII)**

# ГІСТОРЫЯ КАТАЛІЦКІХ ОРДЭНАЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯ: МІСІЯНЕРСТВА І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

***А.Ю. БАРТАШЭВІЧ***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Янкі Купалы)***

*Разглядаецца гісторыя з'яўлення і дзейнасці каталіцкіх місій на беларускіх землях у другой палове XVII стагоддзя. Ваенныя падзеі 1649 – 1667 гадоў і дзяржаўная падтрымка каталіцтва прывяла да рэзкага павелічэння колькасці каталіцкіх прыходаў, у Вялікім Княстве Літоўскім былі запрошаны новыя каталіцкія ордэны. У гэты перыяд каталіцкія місіі дамінуюць у сферы адукацыі і асветы, займаюцца дабрачыннасцю: адчыняюцца новыя калегіумы, пашыраецца школьная сетка, з'яўляюцца першыя шпіталі. Каталіцкае святарства выступала ініцыятарам і арганізатарам агульнагарадскіх урачыстасцей, прысвечаных важным дзяржаўным падзеям і рэлігійным святам, удзел у якіх прымалі гараджане ўсіх веравызнанняў.*

**Уводзіны.** Вайна 1654 – 1667 гадоў прывяла да значных гаспадарчых і культурных страт. Беларускія гарады і мястэчкі стаялі разбуранымі і спустошанымі, занепала значная частка сакральных аб'ектаў. Ад пачатку ваенная кампанія Маскоўскай дзяржавы супраць Рэчы Паспалітай ажыццяўлялася пад лозунгамі абароны праваслаўя і праваслаўных. У адносінах да астатніх маскоўскі ўрад патрабаваў: "костелам не быть… униатам не быть… жидом в Белоруссии не быть и жития никакого не имети…" [1, с. 16]. Касцёлы і кляштары, каталіцкія навучальныя ўстановы зачыняліся, святары мусілі ўцякаць на захад [2, с. 19]. Пасля заняцця Вільні маскоўскае войска і казакі спалілі касцёл св. Яна, будынкі езуіцкага калегіума. Большасць віленскіх каталіцкіх святароў (у тым ліку езуітаў) пакінула горад і межы дзяржавы [2, с. 32]. Падобны лёс напаткаў каталіцкія і ўніяцкія асяродкі Гродна, Нясвіжа, Навагрудка, Пінска, Оршы, Бабруйска і іншых беларускіх гарадоў [2]. Нягледзячы на заяўленыя мэты, маскоўскае і казацкае войска рабавала і знішчала праваслаўныя цэрквы і кляштары [3, с. 361]. Сустракаюцца і такія звесткі: "зважаючы ўвагу на разбурэнне манастыра св. Барбары ў горадзе Пінску і спаленне царквы, каб надалей існаваць магла… ад падаткаў усіх… Рэчы Паспалітай… на чатыры гады вызваляем…" [4, с. 475]. Шэраг дакументаў тычыцца Вільні – па звестках, "непрыяцель масквіцін" цэрквы і касцёлы ў горадзе panішчыў, упрыгожванні, царкоўны рыштунак парабаваў: "срэбра, абразы, званы з царквы Свята-Траецкай, так і з касцёла Св. Казіміра, у айцоў езуітаў скрынку з рыштункам немалым… забралі" [5, с. 182]. Маёмасць і храмы цярпелі і ад рук мясцовага, "лёзнага", люду, які далучаўся да царскага войска [4, с. 424].

Падзеі 1654 – 1667 гадоў раскалолі грамадства на прыхільнікаў і праціўнікаў каралеўскай улады Рэчы Паспалітай, дзяржаўнага ладу, прычым раскол праходзіў па канфесійнай прыкмеце. Пратэстанцкая шляхта ВКЛ на чале з біржанскімі Радзівіламі пайшла на палітычны саюз са Швецыяй – ворагам Кароны (Кейданская ўнія 1655 года) [6, с. 98]. Праваслаўная шляхта і мяшчане масава прысягалі на вернасць маскоўскаму цару (на першапачатковым этапе вайны) і нават змагаліся ў казацкіх загонах (палках) [7, с. 355]. У такіх умовах рыма-каталіцкае веравызнанне ўсё больш становіцца прыкметай палітычнай лаяльнасці каралю і дзяржаве, сімвалам вернасці і патрыятызму. Не дзіўна, што пасля вайны канфесійная праблема стала справай дзяржаўна-палітычнай важнасці [7, с. 356]. Занепадаюць традыцыі талерантнасці, роўнасці, плюралізма. Апусцелыя гарады засяляліся каталіцкай шляхтай, іншаэтнічнымі элементамі. Пасля вызвалення беларускіх гарадоў мясцовая шляхта ў першую чаргу давала грошы і фундушы на аднаўленне каталіцкіх храмаў і кляштараў. Уніяцкія і праваслаўныя храмы, згодна дакументаў, доўгі час "стаялі пусткамі", а некаторыя так і не былі адноўленыя [8, с. 85]. Каралеўская ўлада і мясцовыя ўраднікі (пераважна шляхта і вярхі мяшчанства) імкнуліся да распаўсюджвання і дамінацыі каталіцкай рэлігіі – у гарадах і мястэчках, сваіх маёнтках. У ваенныя часы і за тры пасляваенныя дзесяцігоддзі пасля "патопа" гэта ўвасобілася ў аднаўленні і разбудове старых і фундаванні новых місій каталіцкіх ордэнаў.

**Аднаўленне каталіцкіх місій у беларускіх гарадах. Новыя фундацыі каталіцкіх ордэнаў**

У другой палове XVII стагоддзя на беларускіх землях засноўваюць свае касцёлы і кляштары шматлікія каталіцкія ордэны, што знайшлі прытулак у ВКЛ, новыя гарадскія плацы і фундушы атрымліваюць місіі ордэнаў, што даўно тут жылі. Сейм 1658 года зацвердзіў фундацыю дамініканцаў у Васілішках (Лідскі павет), дзе неўзабаве паўстаў касцёл і кляштар [4, с. 246]. Канстытуцыя ВКЛ 1659 года пацвярджае заснаванне кляштара манахінь-францысканак у Брэсце (якія раней мелі касцёл і кляштар "за валамі" – на прадмесці, але яны былі разбураны падчас вайны) [4, с. 319]. У дакуменце ўказваецца, што новы касцёл і кляштар будуць узведзены ў горадзе каля касцёла бернардзінцаў. У гэтай жа канстытуцыі ўзгадваецца фундацыя дамініканцаў у Расіёнах: пералічваюцца папярэднія прывілеі на фундацыю, якія пацвярджаюцца сеймам [4, с. 320]. У 1662 годзе адбываецца заснаванне плебаніі (касцёла) на некалькіх пляцах ў мястэчку Дывіне (Брэсцкае ваяводства) [4, с. 421]. Сейм 1662 года дазваляе фундаваць дамініканцаў у Хорашчах (Гродзенскі павет) [4, с. 421]. Гэты ж сейм пацвярджае фундацыю Яна Караля Копця манахам-

бенедыктынцам каля мястэчка Янава (Пінскі павет), аднак неўзабаве гэты кляштар бенедыктынцаў быў закладзены ў Гарадзішчы [4, с. 421]. Сейм таксама пацвярдзіў фундаванне Кшыштафам Пацам (канцлер ВКЛ) ордэна камедулаў у сваіх "добрах дзедзічных"; па гэтаму дакументу ордэн камедулаў атрымаў права ствараць свае асяродкі на землях ВКЛ [4, с. 421]. У 1667 годзе права на будаўніцтва ў Камянцу свайго кляштара атрымалі манахі-баніфраты [4, с. 451]. Сеймам 1667 года была пацверджана фундацыя камедулаў у Веграх (Гродзенскі павет) [4, с. 473]. У 1667 годзе права на заснаванне касцёла і кляштара атрымоўваюць дамініканцы ў Пінску, бернардынцы ў Глуску (касцёл і кляштар) [4, с. 474]. Гэтым жа годам датавана з'яўленне манахінь-францысканак у Слоніме, дамініканцаў у Ашмянах [4, с. 474]. Манахіні-брыгіткі ў Брэсце атрымалі фундацыю на новы пляц у горадзе [4, с. 475]. Зважаючы на разбурэнні касцёла і кляштара манахінь-францысканак у Гродна, на сейме 1667 года іх "добры" былі вызвалены ад падаткаў на 4 гады: "абы маглі з руінаў касцёл і кляштар рэстаўраваць" [4, с. 475].

Канстытуцыя ВКЛ 1673 года пашырае "добры" картузіянцаў у Бярозе, узгадвае фундацыю аўгусцінцаў у Міхалішках [9, с. 89]. У гэтым жа годзе быў заснаваны касцёл у прыватных уладаннях пісара ВКЛ К. Пухальскага – Бухавічах (Брэсцкае ваяводства) [9, с. 89]. На сейме 1676 года была пацверджана значная колькасць новых фундацыяў каталіцкіх місій – напрыклад, дамініканцаў у Мсціслаўлі, канонікаў рэгулярных у Вільні і г.д. [9, с. 212]. Андрэй Францыск Катовіч, кашталян віленскі, заснаваў місію кармелітаў босых у Гродна, пад касцёл і кляштар у горадзе былі выкуплены плацы [9, с. 213]. На сейме была пацверджана фундацыя бернардзінцаў у Мазыры: падчас вайны будынкі канвента былі знішчаны, планавалася адбудова касцёла і кляштара на старым месцы [9, с. 213]. На гэтым сейме былі ўхваленыя ўсе папярэднія фундацыі каталіцкіх місій у Брэсце – на гэты час у горадзе стала размясціліся езуіты, аўгусцінцы, брыгіткі; у гэтым жа дакуменце пацвярджалася фундацыя Бухавецкаму касцёлу [9, с. 218]. У 1672 годзе ў Нясвіжы з'яўляецца місія дамініканцаў (заснавальнікам выступіў смаленскі падстолі Васіль Баканоўскі), у 1673 годзе ў горад прыбываюць бенедыктынцы (фундацыя князя Міхаіла і яго сына Караля Станіслава Радзівіла) – у горадзе паўстае касцёл Святога Крыжа [10, с. 445]. Сейм 1678 года ўхваляе заснаванне езуіцкай місіі пры фарным касцёле ў Магілёве – "для абарачэння душ, схізмай апантаных" [9, с. 310]. Разбудова гродзенскай езуіцкай рэзідэнцыі ініцыявала стварэнне місіянерскіх станцый у Гольне, Котры, Дэмбрава, Мерачы, Ротніцы (1664 – 1676) [11, с. 102]. Яшчэ адна місійная пляцоўка гродзенскіх езуітаў з'явілася ў Ваўкавыску [11, с. 102]. Віленскія езуіты значна павялічылі сваю юрыдыку ў сталіцы – у 1678 годзе ім належылі 7 камяніц, якія знаходзіліся на цэнтральных віленскіх вуліцах (Святаянскай, Нямецкай, Замкавай і на рынку) [12, с. 460]. У 1677 годзе сейм зацвердзіў фундацыю баніфратак (касцёл і кляштар) у Навагрудку, паколькі "іх прысутнасць для памнажэння Боскай хвалы нам патрэбная" [9, с. 263]. У 1677 годзе шляхта Слонімскага павета прасіла сейм пацвердзіць фундацыю бенедыктыянак у Слоніме [9, с. 259]. Бенедэктыянкі з'явіліся ў горадзе пасля таго, як іх місію выгналі са Смаленска (пасля вайны, калі горад адыйшоў Маскоўскай дзяржаве) [9, с. 259]. У пастанове сейма (1677), якая вызваляе маёмасць жаночых каталіцкіх ордэнаў ад ваеннага цяжару, узгадваюцца наступныя фундушы: Крамяніцы, Каханаў, Узлаўшчызна, Шыдлоўцы – належылі брыгіткам; Залессе, Зараслаўка (у Гродзенскім павеце) – "добры" манахінь ордэна св. Клары (місія ў Брэсце). Асобна ўзгадваецца мястэчка Адамовічы ("пры цудоўнай выяве Маці Божай грунт і фальварак"), якое вызвалялася ад грамадскіх падаткаў на карысць Гродна [9, с. 264]. На сейме 1678 года місія аўгусцінцаў атрымала прывілей на пусты плац у Вільні [9, с. 308]. Сейм таксама пацвярджае фундацыю віленскіх дамініканак, узгадвае дамініканцаў на Уле (Полацкае ваяводства) [9, с. 308].

У 1670 – 1680-я гады значна павялічваюць свае юрыдыкі каталіцкія місіі ў Гродна – францысканцы (якія адбудавалі свой касцёл і кляштар у 1662 годзе), езуіты, кармеліты босыя [13, с. 180]. Юрыдыкі гродзенскіх ордэнаў маглі займаць цэлыя гарадскія кварталы (дамініканцы, кармеліты, бернардынцы, бернардынкі, брыгіткі) [13, с. 133]. Гродзенскім езуітам належыла два гарадскіх квартала [13, с. 171]. Фундатарамі часцей выступалі шляхцічы, значна радзей – мяшчане.

У другой палове 1660-х гадоў аднаўляюць сваю дзейнасць місіі кармелітаў у Бялынічах, Чаусах, Магілёве, Мсціслаўлі, Вільні [14]. Кармеліцкая фундацыя ў Чэрыкаве ўпершыню ўзгадваецца пад 1669 годам [14, с. 98]. У 1672 годзе кармелітаў у Ліду запрасіў Адам Нарбут (войскі лідскі). Кляштар лідскіх кармелітаў паўстаў, верагодна, у 1680 годзе [14, с. 242]. На працягу 1670 – 1690-х гадоў лідскія кармеліты значна павялічылі сваю нерухомую маёмасць у горадзе [14, с. 243]. У Пацкаве і Даброве ўзніклі дамініканскія місіі, фундаваныя Самуэлем Казімірам Цеханавіцкім – старастам мсціслаўскім (1676 год) [14, с. 341].

У пінскім павеце езуіцкая місія з'явілася ў Лагішыне – мела фарны касцёл. Да гэтай місіі адносіліся капліцы ў Сташанах, Целяханах – былі заснаваныя ў 1670 годзе праз Мікалая Разахоцкага (трокскі цівун) [15, с. 1383]. У 1670-я гады віцебскія езуіты дзякуючы клопату мясцовай шляхты здолелі аднавіць і значна пашырыць сваю рэзідэнцыю (касцёл і кляштар, школьны будынак) [15, с. 1412]. Бернардынскі кляштар у Віцебску быў фундаваны ў 1675 годзе праз Яна Храпавіцкага – ваяводу віцебскага [15, с. 1414]. Гэты жураднік запрасіў у Віцебск місію францысканцаў і перадаў ім "камянічку з плацам" – дзе яны ў хуткім часе пачалі адпраўляць набажэнства "з памнажэннем веры святой каталіцкай паміж разрозненымі ад уніі святой" [9, с. 263]. Пад 1681 годам узгадваецца кармеліцкая сядзіба (касцёл і кляштар) у Няёлавічах (Брэсцкі павет) [14, с. 362]. У 1696 годзе гэтую кармеліцкую сядзібу перанеслі ў Крупчыцы [14, с. 363]. Раман Бенедыкт Твароўскі (падстарасці і падстолі аршанскі) у 1682 годзе стаў фундатарам кармелітаў у

Оршы [14, с. 376]. На сейме 1683 года было пацверджана заснаванне езуіцкага калегіума ў Мінску: "зважаючы на неабходнасць памнажэння хвалы Божай… сярод розных дысідэнтаў…" [9, с. 339]. У 1685 годзе слонімскіх дамініканцаў фундаваў войскі Лідскі – Пакрашынскі [9, с. 368]. У гэтым жа годзе сейм зацвердзіў фундацыю кармелітаў у Жалудку (Лідскі павет) – праз К.Ф. Радзімінскага (староста лідскі) і яго жонку – Ганну Нарушэвічаўну [9, с. 368]. У 1687 годзе ў Магілёве паўстаў бернардзінскі касцёл з кляштарам [14, с. 330]. У 1690 годзе мсціслаўскія езуіты ўжо мелі вялікі калегіум, значную юрыдыку ў горадзе [14, с. 340]. У 1690 годзе Я. Багуслаў Служка (кашталян віленскі, гетман польны ВКЛ) заклаў місію бернардынцаў у сваім мястэчку – Валожыне [9, с. 403]. У тым жа годзе з'явілася фундацыя францысканцаў у вёсцы Лапеніцы Ваўкавыскага павета [9, с. 403]. Мсціслаўскай езуіцкай місіі былі падначалены місіянерскія станцыі ў Кідзіню і Кулікове (Мсціслаўскі павет) [14, с. 340]. Езуіцкія місіі ў Пагосце і Мсціслаўлі таксама ўзвялі новыя будынкі касцёлаў (1685 і 1692 гг. адпаведна) [15, с. 1061]. У 1692 годзе паўстаў касцёл у Фашоўцы [15, с. 1061]; у 1693 годзе на месцы езуіцкай капліцы ў Оршы – драўляны касцёл [15, с. 1061].

**Місіянерства і культурна-асветніцкая дзейнасць**

Навучальныя ўстановы каталіцкіх ордэнаў адыгралі важную ролю ў арганізацыі асветы на беларускіх землях. Пасля "патопа" настаў час супрэмацыі каталіцтва – у адукацыйнай сферы гэта ўвасобілася ў дамінаванні езуіцкай школьнай сістэмы [11, с. 100]. Распаўсюджваючы свой уплыў у ВКЛ, езуіты, акрамя чыста палітычных мэт, ставілі мэту выхавання эліты грамадства ў духе каталіцызму, таму такой важнай з'яўлялася дзейнасць па стварэнні ўласнай сістэмы адукацыі. У руках ордэна езуітаў былі сканцэнтраваны моцныя інтэлектуальныя сілы, ордэн узяў у свае рукі выхаванне моладзі з дапамогай высокаадукаваных педагогаў. На тэрыторыі ВКЛ езуіты стварылі каля 90 пунктаў (рэзідэнцыі, місіі, калегіі), якія на Беларусі дзейнічалі ў Нясвіжы, Пінску, Берасці, Вільні, Мінске, Навагрудку, Гродна, Оршы, Віцебску, Мсціслаўлі, Слуцку і іншых гарадах [16, с. 507].

У 1670 – 1680-я гады віленскі езуіцкі калегіум паўнавартасна аднавіў сваю дзейнасць: пачала працаваць школа рыторыкі, бібліятэка, быў сабраны калектыў выкладчыкаў. У 1690 годзе ў калегіума з'явіўся новы будынак; у хуткім часе пачалі працаваць друкарня, аптэка [10, с. 88]. Езуіты пашырылі сваю дзейнасць у Нясвіжы: быў пабудаваны новы калегіум пры касцёле св. Міхаіла (1689) [10, с. 445]. Рэктар аршанскага езуіцкага калегіума Марцін Калакоўскі ў 1674 – 1677 гадах пашырыў і палепшыў будынкі калегіума, пабудаваў асобны "школьны дом" [15, с. 1060]. У 1680-я гады аршанскі калегіум значна павялічыў набор студэнтаў [15, с. 1061]. Да 1675 года быў адрэстаўраваны касцёл і калегіум езуітаў у Пінску [15, с. 1371]. У 1668 годзе пачала працу віцебская рэзідэнцыя езуітаў (аднавіла сваю дзейнасць школа граматыкі), у 1682 годзе пачаў працаваць калегіум. Да канца стагоддзя віцебская місія атрымала будынкі бурсы і аптэкі [15, с. 1413].

Маштабнай і ўплывовай дзейнасці езуітаў (як і іншых каталіцкіх ордэнаў) на Беларусі спрыяла садзейнічанне з боку каралёў Рэчы Паспалітай, магнатаў-каталікоў. На сродкі заможных прадстаўнікоў палітычнай эліты Княства былі заснаваны многія навучальныя ўстановы і кляштары езуітаў: Радзівіламі – у Нясвіжы, Пінске; Сапегамі – у Брэсце і Вільні; Патоцкімі – у Навагрудку [16, с. 507].

Значная роля ў прапагандзе езуітаў адводзілася дзейнасці сяброў ордэна ў шпіталях і турмах. Шырока прапагандуемая дабрачыннасць з'яўлялася сродкам прыцягнення "дыссідэнтаў" на свой бок. Вялікі ўплыў на масы веруючых мелі прамовы і ўмела арганізаваныя публічныя дыспуты з іншаверцамі [16, с. 506].

Важным элементам духоўнага ўплыву на масы вернікаў была архітэктура езуіцкіх храмаў, таму размяшчэнне езуіцкіх кляштарных будынкаў у цэнтры беларускіх гарадоў нельга лічыць выпадковым. Напрыклад, усходнюю частку гродзенскага Рынку ў першай палове XVII стагоддзя займаў кляштар і касцёл езуітаў [17, с. 85]. У 1664 годзе езуіцкая школа ў Гродна пачынае сваю дзейнасць у якасці калегіума. Пры Гродзенскім езуіцкім калегіуме дзейнічаюць тэатр, бурса, бібліятэка. У 1677 – 1684 гадах і ў 1691 годзе езуіты ўзводзяць новы мураваны будынак калегіума (значна ўзрасла колькасць навучэнцаў) [11, с. 101]. У 1687 годзе гродзенскія езуіты заснавалі аптэку, будынак якой быў узведзены ў 1709 годзе [11, с. 101].

У 1670-я гады полацкія езуіты аднавілі дзейнасць калегіума: працавала школа гуманітарных дысцыплін для свецкіх вучняў, школа рыторыкі для клерыкаў, пашырыліся зборы бібліятэкі [10, с. 206]. Дзякуючы намаганням Міхаіла Байноўскага, рэктара Полацкага езуіцкага калегіума, у 1687 – 1688 гадах былі пабудаваны касцёлы ў Экімані, Рукшэніцы, Гуменёве, Капаровічах, Мосары, Палудовічах, Карпевічах, Сосніцы і новы касцёл Св. Крыжа на полацкім прадмесці [10, с. 207]. У Навагрудку езуіты адчынілі школу "humaniora" (па гуманітарных ведах) ужо ў 1665 годзе, а ў 1679 годзе пачала працаваць школа рыторыкі [15, с. 1295]. У 1690 годзе бабруйская езуіцкая місія стала рэзідэнцыяй, з'явілася школа граматыкі [15, с. 1306].

Стварэнне сеткі езуіцкіх устаноў адукацыі, з аднаго боку, дазваляла шырокім слаям насельніцтва ў беларускіх гарадах (як шляхты, так і мяшчанства) знаёміцца з дасягненнямі гуманітарных навук свайго часу (філасофіі, гісторыі, красамоўства, логікі), з другога боку, адрывала маладую эліту ад нацыянальных каранёў. Асобна трэба сказаць аб ролі езуіцкіх школьных тэатраў, якія значна ўплывалі на грамадскае і культурнае жыццё ў гарадах. Выступленні іх даваліся на гарадскіх плошчах і былі прымеркаваны нейкай

урачыстасці: рэлігійнаму святу (каталіцкае свята Божага Цела), сустрэчы высокага дзяржаўнага ці духоўнага дзеяча, дзяржаўным святам (каранацыя), ваенным перамогам і інш. [18, с. 69]. У другой палове XVII стагоддзя езуіцкія школьныя тэатры дзейнічалі ў 14 беларускіх гарадах, сярод іх – Полацк, Нясвіж, Орша, Пінск, Брэст, Бабруйск, Навагрудак, Мсціслаўль, Гродна, Драгічын, Мінск, Мышы, Магілёў, Слуцк. Да пачатку XVIII стагоддзя колькасць тэатраў узрасла да дваццаці двух [18, с. 68]. Акрамя езуіцкіх каллегій арганізатарам тэатральных пастановак (сацыяльным замоўцам) выступаў магістрат, а таксама каталіцкія брацтвы і касцёлы [18, с. 69].

У канцы стагоддзя езуіты паступова страчваюць манаполію ў сферы адукацыі. Гэта было звязана з наплывам на землі Княства вялікай колькасці іншых манаскіх каталіцкіх ордэнаў, распаўсюджваннем уплыву піяраў [16, с. 509]. Місіі каталіцкіх ордэнаў (кармелітаў, францысканцаў, бернардынцаў, брыгітак і інш.) значна ўплывалі на стан і развіццё культурнага жыцця беларускіх гарадоў. Яшчэ ў 1630 годзе ў Слоніме з’явіліся першыя бернардынцы. У хуткім часе манахі ўзвялі касцёл Святой Троіцы, пры якім дзейнічалі брацтвы святой Ганны і святой Барбары [19, с. 185]. Яшчэ адно брацтва – святога Францыска – было выключна свецкім. Брацтвы займаліся дабрачыннасцю, пры манастыры дзейнічала бурса, знаходзілася манаская бібліятэка [19, с. 186]. Першыя сёстры-бернардзінкі ў Слоніме з’явіліся ў сярэдзіне XVII стагоддзя, у 1698 годзе быў узведзены мураваны касцёл ордэна, да якога пазней быў прыбудаваны манастыр. Пры слонімскім манастыры бернардзінак дзейнічала пачатковая жаночая школа, дзе акрамя духоўных дысцыплін выкладаліся музыка, майстэрства вышыўкі, французкая мова [19, с. 187]. Манастыр канонікаў рэгулярных латэранскіх быў заснаваны ў Слоніме ў 1635 годзе. Сваё прызначэнне прадстаўнікі ордэна бачылі ў адукацыі моладзі, дапамозе ў шпіталях. Ужо ў 1650 годзе ў слонімскай абшчыны з’яўляюцца мураваны касцёл, кляштар, будынак шпіталя, пры манастыры была заснавана бібліятэка [19, с. 188]. Манастыр баніфратаў у Навагрудку быў заснаваны ў 1649 годзе, статут ордэна накіроўваў дзейнасць манахаў на арганізацыю пры манастырах бясплатных шпіталяў, такі шпіталь з сярэдзіны XVII стагоддзя дзейнічаў і ў Навагрудку [19, с. 165]. Дарэчы, навагрудскі кляштар баніфратаў быў першым на тэрыторыі ВКЛ [19, с. 165].

Трэба заўважыць, што рэлігійныя ўстановы арганізоўвалі не толькі асветніцкую, адукацыйную, дабрачынную дзейнасць у гарадах. Беларускія мяшчане ў складзе сваіх карпарацый удзельнічалі ў рэлігійных святочных цырымоніях агульнагарадскога маштаба [18, с. 61]. Сярод іх цэнтральнае месца займала каталіцкае свята Божага Цела. Калі ў пачатку XVII стагоддзя ў ім удзельнічалі толькі католікі і уніяты, то ўжо з сярэдзіны стагоддзя – у абавязковым парадку і праваслаўныя мяшчане [18, с. 88]. Святочнае шэсце на свята Божага Цела (“фэст”) у беларускіх гарадах звычайна праходзіла па сцэнарыю езуітаў: яно ўключала непасрэдна “манстрацыю з целам Ісуса Хрыста” (шэсце), святочнае багаслужэнне пад адкрытым небам, спяванне рэлігійных кантаў і інш. [18, с. 88]. Прадстаўнікі цэхаў ішлі ў пэўным вызначаным парадку, што, мабыць, было абумоўлена як традыцыяй, так і месцам, якое займаў цэх у гарадской іерархіі, на мерапрыемстве прысутнічалі і іншыя мяшчане; сярод кіраўнікоў працэсій ўзгадваюцца каталіцкія святары [18, с. 88]. Дакументы захавалі сведчанні пра правядзенне такіх мерапрыемстваў у апошняй трэці XVII стагоддзя ў Полацку, Магілёве, Мінске, прычым удзел у ім прымалі гаражане ўсіх хрысціянскіх канфесій [18, с. 90]. Буйныя святочныя мерапрыемствы таксама праводзіліся ў гонар юбілейных дат каталіцкай царквы, асвячэння царквы ці касцёла, “каранацыі” знакамітых ікон, кананізацыі святых і інш. Гродзенскія езуіты былі ініцыятарамі і арганізатарамі святочнай працэсіі ў гонар інтрадукцыі іконы Маці Божай Студэнцкай у гродзенскі езуіцкі касцёл (1664) [20, с. 101]. Святочнае мерапрыемства пачалося на Азёрскім прадмесці за горадам, падчас якога ікону асвяцілі, пасля адбылася ўрачыстая імша і прамова. Святочнае шэсце, па сведчаннях відавочцаў, налічвала каля 5 тыс. чалавек [20, с. 104]. Грандыёзнае свята ў гонар кананізацыі Францыска Борджа (“Боргія”) адбылося 10 кастрычніка 1671 года ў Полацку. Свята ўключала трыумфальнае шэсце гарадскіх цэхаў, каталіцкага і ўніяцкага духавенства, тэатральную пастаноўку [18, с. 90]. У Мінску ў красавіку 1697 года адбылася каталіцкая працэсія ў гонар Св. Марка Евангеліста: удзельнікі ішлі шэсцем з крыжамі ад Дамініканскага кляштара, наперадзе неслі харугвы, за якімі ішлі манахі-бернардынцы з распяццем, у гэты ж час у касцёле адбывалася святочная імша. Па сведчаннях відавочцаў, ва ўрачыстасцях прымала ўдзел вялікая колькасць гараджан [18, с. 91]. Асвячэнне кафедральнага ўніяцкага сабора ў Барысаве (1698) стала прычынай агульнагарадскіх урачыстасцей [18, с. 91].

**Заключэнне.** Грамадскі раскол і супрацьстаянне на канфесійнай глебе падчас ваенных падзей 1654 – 1667 гадоў, незваротныя матэрыяльныя страты праваслаўнай царквы і знішчэнне праваслаўнага мяшчанства, маральная дыскрэдытацыя праваслаўных падчас “патопа” прывялі да ўзмацнення “пракаталіцкай” накіраванасці канфесійнай палітыкі дзяржавы, згортвання талерантнасці і раўнапраўя ў адносінах да некаталікоў. Гэтая тэндэнцыя знайшла адлюстраванне ў запрашэнні на землі ВКЛ вялікай колькасці новых каталіцкіх місій і іх фінансавай і матэрыяльнай апекі, а таксама ў рэстаўрацыі і пашырэнні старых фундацыяў каталіцкіх ордэнаў з боку караля, буйных магнатаў – дзяржаўных саноўнікаў Рэчы Паспалітай, а таксама і менш заможнай шляхты ў 70 – 90-я гады XVII стагоддзя. Місіі каталіцкіх ордэнаў займалі актыўную сацыяльную пазіцыю: адчынялі ўстановы адукацыі розных узроўняў, займаліся дабрачыннасцю і аховай здароўя, выступалі арганізатарамі гарадскіх святочных мерапрыемстваў, дзе ўдзельнічала вялікая колькасць гараджан. Гэта, у рэшце рэшт, вяло да пашырэння і ўзрастання папулярнасці

каталіцкай канфесіі ў апошняй трэці XVII стагоддзя, выцяснення і абмежавання грамадскага і культурнага ўплыву праваслаўя і пратэстантызма.

ЛІТАРАТУРА


1. Сагановіч, Г. Невядомая вайна 1654 – 1667 гг. / Г. Сагановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 164 с.
2. Zaleski, S. Jesuici w Polsce / S. Zaleski. – T. III: Praca misyjne nad ludem 1648 – 1773. Czesc I. 1648 – 1700. – Lwow, 1902. – 439 s.
3. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. Губернского правл., 1870. – Т. 3: Акты Брестского гродского суда. – 440 с.
4. Volumina Legum. Tom IV. Prava, konstytucye i przivileie krolestwa Polskiego, Wielkiego Xiestwa Litewskiego y wszystkich prowincyi nalezacych na walnych sejmiech koronnyh. Ab anne 1641 ad annum 1668. – Petersburg: nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1859. – 519 s.
5. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. А.Г. Сыркина, 1878. – Т. 9: Акты Виленского земского суда. – 676 с.
6. Катлярчук, А. У ценю Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае і Швэцыя ў часе эўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст. / А. Катлярчук. – Мінск: ARCHE, 2008, 2009. – 306 с.
7. Сагановіч, Г.М. Царкоўная вунія 1596 г. і пытанне нацыянальнай тоеснасці беларусаў у XVIII ст. / Г.М. Сагановіч // Наш Радавод. – 1996. – Кн. 7. – С. 353 – 357.
8. Сліж, Н. З гісторыі Прачысценскай царквы ў Гародні. XVI – XVIII ст. / Н. Сліж // Гарадзенскі палімпсест: матэрыялы міжнар. навук. канф., Гродна, 7 лістап. 2008 г.; рэдкал. А.Ф. Смаленчук [і інш]. – Гродна – Беласток, 2008. – С. 64 – 96.
9. Volumina Legum. T. V. Prava, konstytucye i przivileie krolestwa Polskiego, Wielkiego Xiestwa Litewskiego y wszystkich prowincyi nalezacych na walnych sejmiech koronnyh. Ab anne 1669 ad annum 1697. – Petersburg: nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. – 480 s.
10. Zaleski, S. Jesuici w Polsce / S. Zaleski. – Krakow, 1905. – T. IV: Dzieje 153 kolegiow i domow jezuitow w Polsce. Czesc I. – 479 s.
11. Левшук, В. Иезуитский коллегиум в Гродно XVII – XVIII стст.: очерк эволюции забытого образовательного учреждения / В. Левшук // Гарадзенскі палімпсест: матэрыялы міжнар. навук. канф., Гродна, 7 лістап. 2008 г.; рэдкал. А.Ф. Смаленчук [і інш.]. – Гродна – Беласток, 2008. – С. 96 – 105.
12. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно: Тип. А.Г. Сыркина, 1893. – Т. 20: Акты касающиеся города Вильны. – 673 с.
13. Borovik, P. Jurydyki miasta Grodno w XV – XVIII w. Stanowy podzial nieruhomosci / P. Borovik. – Suprasl, 2005. – 275 s.
14. Wołyniak. Z przesłości karmelitow na Litwie i Rusi / Wołyniak. – Kraków, 1918. – 806 s.
15. Zaleski, S. Jesuici w Polsce / S. Zaleski. – Krakow, 1905. – T. IV: Kolegia i domy zalozone w drugiej dobie rzadow Zygmunta III, i za rzadow Wladyslawa IV. 1608 – 1648 Czesc III. – 552 s.
16. Карев, Д.В. Иезуиты и культура народов Великого княжества Литовского (II пол. XVI – XVIII в.) / Д.В. Карев // Наш радавод. – 1993. – Кн. 4. Ч. 2. – С. 504 – 510.
17. Гардзееў, Ю. Гродзенскі рынак у XVI – XVIII стст. (праблемы сацыятапаграфічнага развіцця) / Ю. Гардзееў // Краязнаўчыя запіскі. – 2000. – Вып. 5. – С. 80 – 105.
18. Котлярчук, А.С. Праздничная культура в городах России и Белоруссии XVII в.: официальные церемонии и крестьянская обрядность / А.С. Котлярчук. – СПб.: РАН, 2001. – 238 с.
19. Татаринов, Ю.А. Города Беларуси. Гродненщина / Ю.А. Татаринов. – Минск: Смэлток, 2009. – 200 с.
20. Левшук, В. Процессия студентов Гродненского иезуитского коллегиума в 1664 г. как ритуал обозначения центра сакрального пространства города / В. Левшук // Гістарычная ўрбаністыка: асновы метадалогіі і крыніцазнаўчая база: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: І.В. Соркіна (гал. рэд) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 95 – 110.


*Пастyпіў 16.04.2013*

**THE HISTORY OF THE CATHOLIC ORDERS ON THE BELARUSIAN LANDS IN THE SECOND HALF OF 17th CENTURY: THEIR MISSIONS AND THE CULTURAL-EDUCATIONAL ACTIVITIES**

***A. BARTASHEVICH***

*The history of the appearance and the activities of the catholic missions on the Belarusian lands in the second half of 17th century is considered. Military events of 1649 – 1667 and the state support of the Catholicism led to the sharp increase of the catholic parishes, the new Catholic orders were invited to the GDL. In that period of time the catholic missions were dominant in the sphere of education, provided charity: the new collegiums, schools and hospitals were opened. The Catholic priests held the celebrations that were dedicated to the important state and religious events, in which citizens of different confessions took part.*